# Добрыя словы пра родную мову



**«Мова – гэта вялікі народны скарб. Яго нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ».**

***Іван Мележ***



**«Я – беларус, мая родная мова - беларуская».**

***Васіль Быкаў***



**«Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за родную мову».**

***Якуб Колас***

**«Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё  згубіў».**

***Уладзімір Караткевіч***



**«Сёння для нас важней за ўсё — мова, на першым плане павінна быць мова. Будзе мова — будзе нацыянальная свядомасць і будзе Беларусь. Не будзе мовы — не будзе Беларусі».**

***Ніл Гілевіч***





**«Кожны народ  мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – мова».**

***Алесь Разанаў***



**«Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі».**

***Францішак Багушэвіч***

**"Ты, мой брат, каго
зваць беларусам,
Роднай мовы сваёй
не цурайся;
Як ні зрокся яе пад
прымусам,
Так і вольны цяпер
не зракайся».**

***Алесь Гарун***



**Мова родная, мова дзядоў!**
**Іншай мовы мы ў сэрцы**
**не чуем.**
**Мілагучнасцю любых**
**нам слоў,**
**Быццам музыкай, душы**
**чаруем.**

*Ларыса Геніюш*





**Дала мне маці гэту мову,**
**Каб не нямым пайшоў**
**у свет,**
**Дала мне маці гэту мову,**
**Як спадчыну і запавет.**

***Аляксей Пысін***

**«Мова – крыніца чалавечага жыцця».**

***Пімен Панчанка***





**«Любіце і шануйце, як святыню, роднае слова, з якім вас літасцівы Бог на свет пусціў».**

***Францыск Скарына***

# Родная мова

***Пімен Панчанка***

Кажуць, мова мая аджывае
Век свой ціхі: ёй знікнуць пара.
Для мяне яна вечна жывая,
Як раса, як сляза, як зара.
Гэта ластавак шчабятанне,
Звон світальны палескіх крыніц,
Сінь чабору, і барвы зарніц,
І буслінае клекатанне.
Калі ж хто загадае: "Не трэба!" —
Адрачэцца ад мовы народ, —
Папрашу я і сонца, і неба:
Мне не трэба ні славы, ні хлеба,
Асудзіце на безліч нягод.
Толькі месяцаў назвы пакіньце,
Назвы родныя роднай зямлі,
Пра якія з маленства ў блакіце
Бор шуміць і пяюць жураўлі:

**Студзень** — з казкамі снежных аблокаў,
**Люты** — шчодры на сіні мароз,
**Сакавік** — з сакатаннем і сокам
Непаўторных вясновых бяроз,
**Красавік** — час маланак і ліўняў,
**Травень** — з першым каханнем, сяўбой,
**Чэрвень** — з ягаднаю зарой,
**Ліпень** — з мёдам,
З пшаніцаю — **жнівень**,
Спелы яблычны **верасень**,
Светлы **кастрычнік**
У празрыстасці чыстай, крынічнай,
**Лістапад** — залаты лістапад,
**Снежань** — першы густы снегапад...
Ці плачу я, ці пяю,
Ці размаўляю з матуляю —
Песню сваю, мову сваю
Я да грудзей прытульваю.